ТЭСТАВЫЯ ЗАДАННІ
ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ
(РАЗДЗЕЛЫ “МАРФЕМІКА”, “СЛОВАЎТВАРЭННЕ”, “МАРФАЛОГІЯ”)

ВАРЫЯНТ 1

1. Адзначце словы з невытворнай асновай:
   1) добры;
   2) бясшумны;
   3) прыграваць;
   4) багата;
   5) зямля.

2. Адзначце рады аднакаранёвых слоў:
   1) сад, садовы, садоўнік, пасадка;
   2) лаза, лазовы, лазня, пералаз;
   3) соль, салёны, перасолены, саліст;
   4) ніз, нізіна, нізам, нізаць;
   5) азёры, прыазёрны, Паазер’е, Азярышча.

3. Адзначце рады, у якіх усе словы маюць прыстаўку **аб-**:
   1) абіваць, абвязваць, абразаць;
   2) абход, аблёт, абагнуць;
   3) абвіваць, абходзіць, абчэсваць;
   4) абіўка, абсыпаць, абсталяванне;
   5) абточваць, абшыты, абрэзка.

4. Адзначце словы з нулявым канчаткам:
   1) беразняк;
   2) верацяно;
   3) высока;
   4) вільготнасць;
   5) нагор’е.

5. Адзначце словы, будова якіх адпавядае схеме “прыстаўка + корань + суфікс + матэрыяльна выражаны канчатак”:
   1) завоблачны;
   2) воблака;
   3) прыморскі;
   4) найвышэйшы;
   5) дапамагчы.

6. Адзначце словы, напісаныя няправільна:
   1) зайсці;
   2) абыйсці;

3) прыйсці;
4) падыйсці;
5) найгрыш.

7. Адзначце словы, якія няправільна падзелены на марфемы:
   1) абут-ак;
   2) гамон-к-а;
   3) навальніц-а;
   4) па-вуц-ін-а;
   5) праца-ўнік.

8. Адзначце словы, утвораныя суфіксальным спосабам:
   1) веславаць;
   2) водгалас;
   3) невысокі;
   4) ціха;
   5)аднагалосна.

9.Адзначце словы, утвораныя нульсуфіксальным спосабам:
   1) ход;
   2) прышкольны;
   3) пераезд;
   4) сінеча;
   5) географ.

10. Адзначце словы, утвораныя прыставачна-суфіксальным (конфіксным) спосабам:
   1) узлесак;
   2) ручка;
   3) прыгарад;
   4) засценак;
   5) пралеска.

11. Адзначце словы, утвораныя постфіксальным спосабам:
   1) хтосьці;
   2) абязлесіць;
   3) мыцца;
   4) змаладу;
   5) хто-небудзь.

12. Адзначце словы, утвораныя прэфіксальным спосабам:
   1) запісаць;
   2) каласіцца;
   3) заводскі;
   4) звышмагутны;
   5) назаўсёды.

13. Адзначце словы, утвораныя складана-суфіксальным спосабам:
1) аднавясковец;
2) крыгаход;
3) моладзь;
4) іншамоўны;
5) безбароды.

14.Адзначце словы, утвораныя складана-нульсуфіксальным спосабам:
1) хвалярэз;
2) падзяка;
3) буралом;
4) правабярэжжа;
5) вочап.

15. Адзначце сказы, якія ўтрымліваюць словы, утвораныя шляхам пераходу з адной часціны мовы ў другую:
1) Свае людзі заўсёды дапамогуць.
2) Засталіся толькі свае.
3) Вернемся заўтра.
4) Чалавек верыць у лепшае заўтра.
5) Паранены куляй салдат заснуў.

16. Адзначце рады з адушаўлёнымі назоўнікамі:
1) атрад, рота;
2) жанчына, дзіця;
3) кароль, ферзь;
4) карп, шчупак (стравы);
5) адкрыць шпроты, кількі.

17. Адзначце рады з назоўнікамі мужчынскага роду:
1) павідла, метро;
2) палын, медаль;
3) сірата, задзіра;
4) стэп, фламінга;
5) гусь, бра.

18. Адзначце рады з нескланяльнымі назоўнікамі:
1) імя, племя;
2) атэлье, жалюзі;
3) смеласць, гордасць;
4) Осла, Сочы;
5) паліто, пюрэ

19.Адзначце рады з назоўнікамі, якія ў родным склоне адзіночнага ліку маюць канчатак ***–у (-ю)***:

1) твор, стол;
2) натоўп, твар;
3) прыезд, крык;
4) сорам, настрой;
5) суфікс, антонім.

20. Адзначце рады з назоўнікамі, якія ў месным склоне адзіночнага ліку маюць канчатак ***–е***:

1) конь, камень;
2) дарога, трывога;
3) вёска, сцежка;
4) зброя, сям'я;
5) даліна, шыпшына.

21. Адзначце словазлучэнні, у якіх прыналежныя прыметнікі ўтвораны правільна:

1) Дзянісава сумка;
2) Віцін ручнік;
3) зубровы сляды;
4) вавёрчыны сховы;
5) Ганнава сукенка.

22. Адзначце словазлучэнні, у якіх прыналежныя прыметнікі ўжываюцца ў значэнні якасных:

1) лісіная нара;
2) лісіная хітрасць;
3) курыны розум;
4) курынае гняздо;
5) баброва хатка.

23. Адзначце, якія займеннікі ўжываюцца ў сказе *Нехта нябачны ў шэрым тумане ціха гукаць мяне вечарам стане голасам, поўным пяшчоты і болю*:

1) асабовы;
2) прыналежны;
3) азначальны;
4) няпэўны;
5) адмоўны.

24. Адзначце словы, якія могуць ужывацца са зборнымі лічэбнікамі:

1) кіламетры;
2) акуляры;
3) гусі;
4) пчолы;
5) дзеці.

25. Адзначце лічэбнікі, у якіх зроблены памылкі пры скланенні:

1) тромстам дзевяноста пяці;
2) трыццаць другому;
3) шэсцьсот сямюдзесяццю трыма;
4) пяцідзесяці другому;
5) аб адна трэцяй.

## ВАРЫЯНТ 2

1.Адзначце словы з вытворнай асновай:

1) многа;
2) характар;
3) шыццё;
4) цікавы;
5) быль.

2. Адзначце рады аднакаранёвых слоў:

1) лірыка, лірычны, лірычна;
2) машыніст, машынны, машынальны;
3) метад, метадам, метады;
4) падводнік, абязводзіць, вадзяны;
5) важны, важыць, важак.

3.Адзначце рады, у якіх усе словы маюць прыстаўку **пад-**:

1) падарыць, падрыхтаваць, падвязаць;
2) падтрымка, падаконнік, падножка;
3) падабенства, падаслаць, падганяты;
4) падплыванне, падпалены, падасінавік;
5) Падняпроўе, падпечак, падцягнуты.

4. Адзначце словы з нулявым канчаткам:

1) весела;
2) асаблівасць;
3) конь;
4) дно;
5) вецер.

5.Адзначце словы, будова якіх адпавядае схеме “прыстаўка + корань + суфікс + матэрыяльна выражаны канчатак”:

1) дапазна;
2) прыморскі;
3) вывучэнне;
4) безрукаўка;
5) светлаваты.

6.Адзначце словы, напісаныя няправільна:

1) прайсці;
2) абыйсці;
3) пайменна;
4) сыйсціся;
5) увайсці.

7.Адзначце словы, якія няправільна падзелены на марфемы:

1) буды-нак;
2) вась-м-ёра;
3) па-ніж-а-н-ы;
4) па-ціху;
5) за-буд-ов-а.

8. Адзначце словы, утвораныя суфіксальным спосабам:

1) капусны;
2) правабярэжны;
3) невысокі;
4) весела;
5) папялішча.

9.Адзначце словы, утвораныя нульсуфіксальным спосабам:

1) прыход;
2) прыгарад;
3) раз’езд;
4) зелень;
5) чырванець.

10. Адзначце словы, утвораныя прыставачна-суфіксальным (конфіксным) спосабам:

1) здаўна;
2) раскопкі;
3) падснежнік;
4) здзяйсненне;
5) кудысьці.

11. Адзначце словы, утвораныя постфіксальным спосабам:

1) штосьці;
2) будавацца;
3) жыхарства;
4) абы-хто;
5) які-небудзь.

12. Адзначце словы, утвораныя прэфіксальным спосабам:

1) надпісаць;
2) неглыбокі;
3) забруджанасць;
4) чырванець;
5) выгнуць.

13. Адзначце словы, утвораныя складана-суфіксальным спосабам:
1) васьмігадзінны;
2) малавопытны;
3) вадаправодны;
4) усебаковасць;
5) бязрогі.

14.Адзначце словы, утвораныя складана-нульсуфіксальным спосабам:
1) левабярэжжа;
2) усенародны;
3) ледакол;
4) замежны;
5) глебазачэп.

15. Адзначце сказы, якія ўтрымліваюць словы, утвораныя шляхам пераходу з адной часціны мовы ў другую:
1) Другая краіна, другія малюнкі.
2) У шпіталі засталіся толькі раненыя.
3) Кожны дзень ідзе дождж.
4) Кожны адказвае сам за сябе.
5) Ранены куляй салдат стагнаў.

16. Адзначце рады з адушаўлёнымі назоўнікамі:
1) заяц, леў (цацкі);
2) туз, валет;
3) моладзь, студэнцтва;
4) звяр’ё, куп’ё;
5) мярцвяк, тапелец.

17. Адзначце рады з назоўнікамі жаночага роду:
1) безліч, моц;
2) вятрыска, нажышча;
3) забіяка, задзіра;
4) глыб, рэч;
5) далячынь, далонь.

18. Адзначце рады з нескланяльнымі назоўнікамі:
1) стрэмя, бярэмя;
2) кашпо, меню;

3) рашучасць, цюль;
4) Перу, Місуры;
5) журы, камюніке.

19.Адзначце рады з назоўнікамі, якія ў родным склоне адзіночнага ліку маюць канчатак ***–у (-ю)***:

1) вецер, рамантызм;
2) сшытак, хлеб;
3) калгас, чмель;
4) прастор, краявід;
5) метад, трагізм.

20. Адзначце рады з назоўнікамі, якія ў месным склоне адзіночнага ліку маюць канчатак ***-у (-ю)***:

1) камбрыг, каваль;
2) конь, слон;
3) герой, камандзір;
4) луг, склон;
5) Васіль, цесць.

21. Адзначце словазлучэнні, у якіх дапушчаны граматычныя памылкі:

1) у сіней сукенцы;
2) ранішняе сонца;
3) у дарагом касцюме;
4) па жоўтаму лісцю;
5) да суседняга дома.

22. Адзначце словазлучэнні, у якіх адносныя прыметнікі ўжываюцца ў значэнні якасных:

1) жалезная логіка;
2) дубовыя дзверы;
3) залатыя рукі;
4) каменны склеп;
5) каменнае сэрца.

23. Адзначце, якія займеннікі ўжываюцца ў сказе *Маладыя жаўтаватыя апенькі і варушкі абляпілі пні. Іх нямнога: не іхняя яшчэ пара:*

1) асабовы;
2) прыналежны;
3) азначальны;
4) указальны;
5) адносны.

24. Адзначце словы, якія могуць ужывацца са зборнымі лічэбнікамі:

1) юнакі;
2) іголкі;

3) нажніцы;
4) птушаняты;
5) кілаграмы.

25. Адзначце лічэбнікі, у якіх зроблены памылкі пры скланенні:
1) сямідзесяці трэцяму;
2) чатырмастамі пяццюдзесяццю дзвюма;
3) пяцідзесяці аднаму;
4) тысяччу рублямі;
5) дзевяцістамі трыма.